**КАПІ́ТЭЛЬ** (ад позналац. capitellum галоўка), па-мастацку аформленая верхняя частка нясучага элемента бэлечна-стоечнай канструкцыі (калоны, паўкалоны, пілястры); адзін з элементаў ордара, які вызначае яго тыпалагічную разнастайнасць. Выкарыстоўваецца ў аздабленні фасадаў і інтэр'ераў жылых, грамадскіх, культавых пабудоў, у архітэктуры малых форм. У архітэктуры Беларусі прадстаўлена класічнымі тыпамі, сфарміраванымі ў межах антычнага ордара. У дарычным ордары К. складаецца з эхіна (акруглай падушкі) і *абака* (квадратнай пліты пад архітравам) і аддзяляецца ад ствала калоны гарызантальнымі ўрэзамі гіпатрахеліёна — шыйкі (званіца *Валожынскага касцёла Святога Юзафа*). К. іанічнага ордара ўключае прамавугольную ў плане абаку і эхін у выглядзе падушкі з валютамі (балюстрамі), пад якой знаходзіцца рэльефны дэкаратыўны пояс (*Шчучынскі палац*). У вуглавой іанічнай К. валюты размяшчаюцца пад вуглом 45° да фасадаў. Карынфскую К. утварае стылізаваная карзіна з лістамі аканта, размешчанымі ў 2 рады па прынцыпе чаргавання, па 8 у кожным (лісты верхняга рада ў 2 разы вышэйшыя), паміж якімі — сцёблы з валютамі, асобныя з іх падтрымліваюць чатырохвугольную пліту са зрэзанымі вугламі — абаку (будынак КДБ у Мінску). Як элемент ордарнай пластыкі атрымала пашырэнне ў Беларусі ў палацавым і культавым дойлідстве барока і класіцызму, архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў неакласіцызму, мадэрну, ампіру.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ